# *Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў*

## Салдат у баі, салдат у працы

Лёгкі ветрык урываецца праз адчыненае акно ў палату, ласкава развявае фіранку. Цішыня. Нават не верыцца, што недзе яшчэ ідзе вайна. Салдат так задумаўся, што не заўважыў, як падыйшла медсястра.

— Чытай, — ціха сказала яна і працягнула свежы нумар «Праўды».

Разгарнуў яе і... «Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза сержанту Жмуроўскаму, Дзмітрыю Пятровічу...».

Адразу шумна стала ў палаце. З усіх бакоў пацягнуліся сяброўскія рукі.

...Ішоў 1944 год. Батальён, у якім Дзмітрый быў кулямётчыкам, падыходзіў да мяжы з Румыніяй. Атрыманы загад: пераправіцца праз раку Прут і сваім агнём прыкрываць пераправу асноўных сіл.

Ноч ахутала зямлю. Ні зоркі ў небе, ні агеньчыка на зямлі. Ціха стараючыся не шамацець галькай, спусцілі на ваду плоцікі. Недзе ўнізе затрапятала халодная хваля.

Вось і сярэдзіна ракі. Са свістам узляцела ракета, лопнула над галавой, за ёй другая, трэцяя. Стала светла, як днём. Трасіруючыя кулі, нібы ніткі, звязалі берагі. Смерць танцавала вакол па вадзе. Пантонаў станавілася ўсё менш. Але людзі плылі, спяшаліся да другога берагу. Хутка выбраліся на сушу. Іх дзевяць. У іх два кулямёты. Ззаду Прут, а ўперадзе вораг.

— Без каманды не страляць, — пачуўся ціхі голас Жмуроўскага.

Пяць дзён і пяць начэй некалькі храбрацоў адбівалі па дваццаць атак ворага. Вакол змучаная зямля, трупы, скрогат металу. Здавалася, гэтаму не будзе канца...

Раскацістае «ура» надало сіл. Азірнуўшыся, Дзмітрый убачыў салдат са свайго батальёна...

А раніцай батальён пайшоў у наступленне на прыбярэжнае сяло Кірпіцы. Зноў па-геройску змагаўся з ворагам Дзмітрый...

З рук у рукі пераходзіць газета. У ёй — імя сына-героя. А ў той жа дзень у шпіталь прыйшла «Советская Белоруссия» з партрэтам маці Дзмітрыя Жмуроўскага. Сярод фатаграфій лепшых людзей калгаса «Героя працы» выдзяляецца просты і суровы, такі знаёмы жаночы твар. «Мама! І ты наперадзе! Гэта добра, вельмі добра», — падумаў сын.

Прайшлі гады. Пасля вайны закончаны інстытут, аспірантура. Цяпер Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі—дацэнт нашага ўніверсітэта, ён рыхтуе доктарскую дысертацыю, вядзе вялікую грамадскую работу пры Фрунзенскім райкоме партыі. Хочацца пажадаць яму вялікіх поспехаў!

Л. КАМАРОЎ,
студэнт 1 курса вяч. аддз. журналістыкі.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (573) Панядзелак, 6 ліпеня 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

## *ГЕРОІ ПОБАЧ З НАМІ*

Дацэнт кафедры палітычнай эканоміі Сцяпан Яфімавіч Янчанка быў актыўным удзельнікам усенароднага партызанскага руху ў Беларусі, які разгарнуўся ў першыя ж дні вайны. Гэта сціплы і з выгляду непрыкметны чалавек вельмі скупа гаворыць пра сябе. Але ён ажыўляецца пры ўспамінах пра сваіх баявых сяброў.

З чэрвеня 1942 года С. Янчанка быў памочнікам камісара па камсамольскай рабоце 35-й партызанскай брыгады, а таксама сакратаром Бялыніцкага падпольнага райкома камсамола. Партызанскія атрады пастаянна раслі за лік мясцовага насельніцтва. Людзі ішлі ў лясы па аднаму, групамі, нават цэлымі вёскамі. Так, да брыгады далучыліся жыхары вёсак Плёнка і Ракотка Горацкага раёна.

У задачу Сцяпана Янчанкі ўваходзіла арганізацыя і навучанне метадам партызанскай вайны людзей, што прыйшлі ў лясы. Акрамя таго, ён удзельнічаў у баявых аперацыях брыгады: у знішчэнні жывой сілы і тэхнікі ворага, разбурэнні яго камунікацый, мастоў і эшалонаў.

У красавіку 1943 года брыгада атрымала загад перайсці з Горацкага раёна ў Сенненскія лясы для злучэння з атрадам Канстанціна Заслонава. Шлях праходзіў праз месцы, занятыя немцамі. Таму было прынята рашэнне ісці ў розных кірунках групамі па сто чалавек. На месцы былі пакінуты Г. Думчаў, намеснік камандзіра брыгады, і С. Янчанка. Яны атрымалі заданне набраць папаўненне ў сто чалавек, пасля гэтага дагнаць брыгаду і далучыцца да яе.

Гэтае заданне было паспяхова зыканана. У атрад уступілі 153 добраахвотнікі, і 5 мая новы атрад выступіў у паход. Рухаліся днём разрозненымі групамі, змешваючыся з насельніцтвам вёсак і сёл, праз якія праходзілі.

Вялікую дапамогу атраду аказвала група сувязных, якімі кіраваў вопытны партызан А. Васільеў. Але намечаны маршрут прыйшлося змяніць, бо ў атрадзе аказаўся здраднік А. Гайдамак, які перайшоў да немцаў. Камандаванне атрада (камісар Саўчак, Думчаў і Янчанка) прыняло рашэнне рызыкоўнае, але правільнае: перайсці Днепр у непрыкрытым лясамі месцы ля вёскі Нізок. Лодачнік (на жаль, імя яго засталося невядомым), рызыкуючы жыццём, зрабіў 76 рэйсаў, перавозячы партызан з аднаго берагу Дняпра на другі.

На ўсім шляху атраду дапамагалі цудоўныя савецкія людзі. З вялікай цеплынёй успамінае Сцяпан Яфімавіч жыхарку вёскі Панізоўе Марыю Кустову, якая дапамагла ўстанавіць сувязь з партызанскім цэнтрам; брата і сястру Раісу і Васю Мацюшэнкаў з вёскі Альхоўка; Людмілу Шыбека, якая з незвычайнай смеласцю правяла атрад праз нямецкія гарнізоны ў раёне Оршы.

3 ліпеня 1944 года партызанскі атрад, у якім змагаўся за вызваленне роднай Беларусі Сцяпан Яфімавіч Янчанка, злучыўся з часцямі Савецкай Арміі ў раёне вёскі Колбча Клічаўскага раёна.

За ўдзел ў партызанскім руху Сцяпан Яфімавіч узнагароджаны ордэнам «Чырвоная Зорка», медалямі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» І ступені і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Л. КАРОБКІНА.



У гэтыя дні тысячы мінчан і гасцей сталіцы прыходзяць да помніка на плошчы Перамогі, каб ушанаваць памяць герояў, якія аддалі жыццё за шчасце і незалежнасць роднай зямлі.

На здымку: студэнты падрыхтоўчага факультэта Закарыо Авала (Кенія), Арланда Ланда (Куба) і другакурснік хімфака Фёдар Лахвіч ля вечнага агню на плошчы Перамогі.

Фота У. Будая.

## Іх імёны не забудзем

Ленінскі камсамол у гады Вялікай Айчыннай вайны баявымі справамі даказаў беззапаветную адданасць сваёй Радзіме і партыі. У першых радах змагаліся і камсамольцы нашага ўніверсітэта. Высокай маральнай стойкасцю, мужнасцю і гераізмам вызначаўся іх шлях.

Смерцю герояў загінулі ў баях за свабоду Радзімы былыя сакратары камітэта камсамола ўніверсітэта Іван Рыбакоў і Абрам Фэрдар. Ніколі не знікнуць з памяці таварышаў светлыя вобразы камсамольцаў гістарычнага факультэта Мікалая Бабчынскага і Афанасія Налівайкі — добраахвотнікаў-дэсантнікаў, якія загінулі ў час вызвалення роднай Беларусі.

Пад Ленінградам загінуў старшы лейтэнант Мікалай Кукарэка, былы студэнт геаграфічнага факультэта.

На заснежаных прасторах пад Мажайскам, адбіваючы танкавую атаку ворага, загінуў член камітэта камсамола Леанід Сокал — выдатнік вучобы, які атрымоўваў стыпендыю імя XX-годдзя камсамола. Пяць фашысцкіх танкаў знішчыла яго падраздзяленне ў гэтым баі.

У гестапаўскіх засценках былі замучаны камсамольцы-падпольшчыкі Сяргей Гуляеў і Алік Суша. Светлая памяць аб камсамольцах універсітэта, якія загінулі ў баях за шчасце Радзімы, будзе жыць у нашых сэрцах.

С. ВАСІЛЬЕЎ.

## *Гавораць замежныя студэнты*

**Агусцін МАЛІНА Г. (Куба),**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта.**

З гісторыяй барацьбы на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны мы пазнаёміліся яшчэ на Кубе. Па кнігах і фільмах ведалі пра гераічную абарону Брэсцкай крэпасці. Цяпер мы наведалі крэпасць і сваімі вачыма ўбачылі тое, пра што раней толькі чулі. І гэта зрабіла вельмі вялікае ўражанне.

Пра партызанскую барацьбу ў Беларусі нам расказвалі яе ўдзельнікі, а таксама фільмы і экскурсіі па месцах партызанскіх баёў. Мы ведаем, як быў разбураны Мінск за час вайны. А цяпер перад намі вялікі цудоўны горад.

У слаўную гадавіну беларускі народ успамінае пра вайну, як пра тое, што ніколі больш не павінна стаць на шляху да камунізма.

**Чарльз ОКАЦЬ (Кенія),**
**студэнт падрыхтоўчага факультэта.**

Нядаўна перад намі, замежнымі студэнтамі, выступіла Марыя Барысаўна Осіпава, актыўная ўдзельніца партызанскага руху ў Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Яна расказала, якімі цяжкімі былі гады акупацыі рэспублікі нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Мы пераканаліся, што савецкія жанчыны нароўні з мужчынамі змагаліся супраць ворага. Подзвігі герояў заўсёды будзе захоўваць памяць народа.

Ад імя афрыканскіх студэнтаў я хачу сказаць, што без перамогі савецкага народа ў другой сусветнай вайне народы Афрыкі не маглі б будаваць новае жыццё. Мы вельмі ўдзячныя за дапамогу, якую аказваюць нам краіны сацыялістычнага лагера і, у першую чаргу, Савецкі Саюз. Ад усёй душы віншую беларускі народ з 20-годдзем вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў!

*Лічбы, факты*

## Універсітэт за 20 гадоў

У азнаменаванне 30-годдзя Беларускай ССР Савет Міністраў Саюза ССР і ЦК ВКП(б) 1 студзеня 1949 года прысвоілі імя Уладзіміра Ільіча Леніна Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту.

* * *

У 1944 годзе на шасці факультэтах нашага ўніверсітэта вучыліся 290 студэнтаў, з іх 90 працэнтаў жанчын.

* * *

На дзевяці факультэтах універсітэта (фізічным, хімічным, матэматычным, біялагічным, геаграфічным, філалагічным, гістарычным, юрыдычным і завочным) вучацца каля 10 тысяч студэнтаў. Навуковую работу вядуць 59 кафедраў. Больш за 550 выкладчыкаў, у тым ліку 217 кандыдатаў і дактароў навук, забяспечваюць высокі ідэйна-тэарэтычны ўзровень падрыхтоўкі кадраў.

* * *

1 жніўня 1944 года Беларускі дзяржаўны універсітэт быў рээвакуяваны з падмаскоўнай станцыі Сходня ў Мінск. Матэрыяльна-тэхнічная база ўніверсітэта амаль поўнасцю была знішчана: асноўныя вучэбныя карпусы—біялагічны і хімічны — спалены, абсталяванне лабараторый, кабінетаў, музеяў знішчана, кнігі пакрадзены. Адзіным уцалелым вучэбным будынкам быў невялікі корпус фізіка-матэматычнага факультэта.

* * *

Цяпер, у 1964 годзе, наш універсітэт мае пяць вучэбных карпусоў (галоўны корпус уступіў у строй дзеючых у дні святкавання саракагоддзя ўніверсітэта), будуецца яшчэ адзін вучэбны корпус. Студэнты ўніверсітэта жывуць у пяці інтэрнатах. Універсітэт мае біялагічную і біелага-геаграфічную вучэбна-навуковыя станцыі, гісторыка-археалагічны, мінералагічны, заалагічны музеі, вылічальны цэнтр, нумізматычны кабінет, дзесяткі лабараторый і кабінетаў.

* * *

На 1 студзеня 1945 года універсітэцкая бібліятэка налічвала 27,2 тысячы тамоў, на 1/I 1955 года—397,6 тысячы, на 1/I 1964 года—697,4 тысячы тамоў. У 1945 годзе ў бібліятэцы было запісана толькі 1150 чытачоў, у 1955—5190, у 1963—10315. Вельмі паказальны рост і лічбы кнігавыдач. У 1945 годзе — 43680, у мінулым годзе—843480.

# НАШ РОДНЫ ДОМ

У цэнтры беларускай сталіцы, насупраць Дома Урада стаіць вялізны, другі па велічыні ў Мінску, будынак галоўнага корпуса нашага ўніверсітэта. Ён пабудаваны да знамянальнай даты — саракагоддзя з дня заснавання ўніверсітэта.

Тут, у галоўным корпусе, створаны ўсе ўмовы для плённай вучобы студэнтаў — у будучым спецыялістаў розных галін народнай гаспадаркі і культуры. У распараджэнні студэнтаў фізічнага і матэматычнага факультэтаў —цудоўныя аўдыторыі і лабараторыі, абсталяваныя па апошняму слову тэхнікі. Студэнты-філолагі заўсёды могуць выбраць ва ўніверсітэцкай бібліятэцы кнігі розных часоў і розных народаў: тут маецца літаратура старагрэчаская і эпохі Адраджэння, бессмяротныя творы Шэкспіра і Гётэ, французскіх асветнікаў і англійскіх раманістаў XIX стагоддзя, навінкі савецкай і замежнай літаратуры. У трох чытальных залах для студэнтаў і адным для аспірантаў і навуковых работнікаў днём і ўвечары стаіць працоўная цішыня.

Вы цікавіцеся спартыўным жыццём? У будынку галоўнага корпуса маецца добра абсталяваная спартыўная зала. Спытайцеся ва ўніверсітэцкіх спартсменаў, у чым яны маюць патрэбу, чаго не хапае ім. Яны, безумоўна, адкажуць:

— Лепшых умоў для пастаянных трэніровак, выступленняў жадаць нельга.

І гэта сапраўды так. Спартыўная зала ўніверсітэта — адна з лепшых у горадзе. Тут праходзяць не толькі ўніверсітэцкія, але і многія гарадскія спаборніцтвы.

Пры будаўніцтве галоўнага корпуса было ўлічана яшчэ адно жаданне моладзі — жаданне добра адпачыць, павесяліцца. Канцэртная зала на 1070 месц часта бывае запоўнена да адказу, калі на сцэне ідзе чарговае выступленне ўніверсітэцкай мастацкай самадзейнасці, майстэрства якой не так ужо далёка ад прафесіянальнага.

А калі глянуць на іншыя карпусы ўніверсітэта? Так, іх вонкавы выгляд менш эфектны, чым выгляд іх малодшага па ўзросце сабрата. Але, сапраўды, студэнты філалагічнага, юрыдычнага, біялагічнага, геаграфічнага і хімічнага факультэтаў ніколі не скардзіліся на гэта. Яны ганарацца ўнутраным зместам сваіх карпусоў.

У біякорпусе, на другім паверсе, размешчаны цудоўныя экспазіцыі заалагічнага музея. У хімічным корпусе працуе мінералагічны музей, дзе сабраны многія ўзоры горных парод. У будынку па вуліцы Чырвонаармейскай, што знаходзіцца насупраць «беларускай Ленінкі», маецца выдатна абсталяваны кабінет крыміналістыкі. Гэта для будучых юрыстаў. Студэнты-філолагі маюць свае кабінеты: рускай і беларускай мовы, беларускай, рускай і замежнай літаратуры, журналістыкі, а таксама фоталабараторыю.

Усё для плённай вучобы, для ўсебаковага развіцця маецца ў нашым універсітэце...

А палавіне трэцяй гадзіны дня звініць апошні званок з лекцый для студэнтаў стацыянара. Адны спяшаюцца на новы фільм( ах, да пачатку засталося толькі дзесяць хвілін), другія накіроўваюцца на пасяджэнне навуковага гуртка (цяжка пасля заняткаў, але трэба...), а большасць усё ж дамоў, для многіх гэта значыць — у інтэрнат.

Інтэрнаты ўніверсітэта сталі другім домам для тых, хто прыехаў вучыцца ў Мінск з усіх раёнаў Беларусі, з суседніх рэспублік, з-за мяжы. З кожным годам узрастае імкненне моладзі да ведаў, павялічваецца набор студэнтаў і павялічваецца... патрэба ў новых кватэрах для студэнтаў, г. зн. у новых інтэрнатах.

Вуліца Кастрычніцкая. Прыгожыя будынкі, здзіўляюча падобныя на... гасцініцу «Юнацтва» ў Маскве. Не так даўно тут была пустэч. А вось летась вырас новы інтэрнат для студэнтаў універсітэта на 800 месц. З усімі камунальнымі зручнасцямі і, чэснае слова, з камфортам. Інтэрнат нават унутры нагадвае першакласную гасцініцу: дывановыя дарожкі, цудоўна афармленыя сцены. За парадкам у інтэрнаце сочаць самі студэнты.

А ўсяго ў 5 інтэрнатах універсітэта жывуць 2800 чалавек. Для іх інтэрнат стаў родным домам.

М. КАЗАКЕВІЧ.

# ПЕРШЫ КРОК ДА ПРАФЕСІІ

У гэтым навучальным годзе студэнты 1 курса аддзялення журналістыкі праходзілі вучэбную практыку ў шматтыражных газетах буйных прадпрыемстваў горада: трактарнага, аўтамабільнага, матавеласіпеднага, шарыкападшыпнікавага заводаў, камвольнага камбіната, а таксама ў «Беларускім універсітэце».

Вопыт прайшоўшага года зноў пацвярджае мэтазгоднасць гэтай формы журналісцкай вучобы. Студэнты праяўляюць вялікую цікавасць да вучэбнай практыкі ў газетах, з нецярплівасцю чакаюць яе пачатку. У час практыкі, да таго ж, студэнты знаёмяцца з буйнейшымі прадпрыемствамі, з цудоўнымі людзьмі, што працуюць на іх. Цяжка пераацаніць значэнне падобных сувязей з рабочымі прадпрыемстваў, з пункту гледжання выхавання студэнтаў.

Найбольш паспяхова прайшла практыка студэнтаў у газеце «Трактор». Рэдактар У. Бабровіч праз некалькі дзён пасля пачатку практыкі звярнуўся да студэнтаў са смелай прапановай: выпусціць спецыяльны нумар, прысвечаны пуску ліцейнага цэха № 2. Такое давер'е рэдактара акрыліла практыкантаў. З вялікім уздымам узяліся яны за выкананне задання і паспяхова справіліся з ім. Пра тое, як цёпла быў сустрэты гэты нумар, гаворыць такі факт. Сакратар камітэта камсамола цэха заявіў: «Гэты нумар газеты кожны рабочы нашага цэха захавае сабе на памяць».

Менш паспяхова прайшла практыка студэнтаў у «Аўтазаводце». Вельмі ўжо доўга цягнулася афармленне дакументаў на права наведвання завода. Да таго ж, да практыкантаў не было праяўлена дастатковай увагі з боку работнікаў газеты.

Недахопам у арганізацыі практыкі з'яўляецца тое, што не ўсе рэдакцыі газет прыцягваюць студэнтаў да дзяжурстваў у друкарні пры выпуску чарговага нумару, не абмяркоўваюць апублікаваныя матэрыялы практыкантаў на «лятучках».

Улічваючы ўсё ўзрастаючае значэнне вучэбнай практыкі ў спецыяльнай падрыхтоўцы студэнтаў, кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку і кожны выкладчык яе будуць узмацняць увагу да гэтага важнага ўчастка журналісцкай вучобы.

М. ЗЯРНІЦКІ,
дацэнт кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

## Інтэрв'ю са старшынёй дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі

*Наш карэспандэнт звярнуўся да старшыні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, рэдактара газеты «Звязда» В. А. Пыжкова з пытаннем, як праходзяць экзамены на аддзяленні журналістыкі. Вось што адказаў Васіль Андрэевіч Пыжкоў:*

*— На маю думку, добра. Большасць студэнтаў рыхтавалася да экзамену грунтоўна і выявіла глыбокія веды. З цікавасцю мы, члены камісіі, слухалі, як адказвалі на пытанні выпускнікі Г. Айзенштат, А. Гарбачова, Н. Ісачанка, У. Стэльмах і іншыя. Адчуваецца, што да работы ў друку яны добра падрыхтаваліся, набылі трывалыя веды.*

*Частка ж студэнтаў слаба падрыхтавалася да завяршаючага этапа сваёй вучобы. Пра гэта сведчылі павярхоўныя веды Ж. Дзёмінай, А. Кабаковіч, М. Рыбака, Я. Сініцы, І. Ванцянкова і некаторых іншых.*

*У ходзе экзаменаў высветлілася, што студэнты лепш ведаюць гісторыю партыйна-савецкага друку, чым пытанні яго тэорыі. На гэта кафедры, відаць, трэба звярнуць увагу. Студэнтам трэба памятаць, што разуменне праблем тэорыі журналісцкай справы, добрая асвядомленасць аб дзейнасці газет і часопісаў, радыё і тэлебачання на сучасным этапе неабходны для паспяховай работы кожнага журналіста.*

# ГЕРОІКА БАРАЦЬБЫ НА ЭКРАНЕ

У гэтыя святочныя дні на экраны Мінска і рэспублікі выйшаў дакументальны фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі». Сказаць, што ён новы, будзе не зусім дакладна. Дваццаць гадоў таму назад быў выпушчаны фільм пад такой жа назвай. У ім адлюстраваны хвалюючыя эпізоды барацьбы за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, злачынствы гітлераўцаў на нашай зямлі. Фільм здымалі дзесяткі аператараў на Беларускіх франтах, а таксама ў партызанскіх злучэннях. Зараз фільм адноўлены, дапоўнены кадрамі і эпізодамі, якія ўзяты з нямецкай хронікі тых часоў.

Незабыўныя кінадакументы пановаму асэнсаваныя аўтарам і рэжысёрам Міколам Садковічам. У стварэнні першага варыянта ўдзельнічаў таксама старэйшы беларускі кінарэжысёр Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін.

Выкрываючая сіла фільма «Вызваленне Савецкай Беларусі» вялізная. Яна — у фактычнай дакладнасці, непаўторнасці адлюстравання на кіналенце матэрыялу, у публіцыстычнай страснасці і грамадзянскім пафасе аўтараў. Добрую справу зрабілі работнікі Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна - дакументальных фільмаў, узнавіўшы гэтую непаўторную кінастужку. Паглядзець яе карысна кожнаму, асабліва моладзі, якая нарадзілася пасля вайны і мала ведае яе суровую праўду.

Дзеячы беларускага кінамастацтва не адзін раз звярталіся да тэмы вайны, барацьбы савецкага народа за сваю свабоду і незалежнасць. У пасляваенны час аб гераізме і мужнасці лепшых дачок і сыноў беларускага народа створаны дзесяткі дакументальных фільмаў. Яркія вобразы патрыётаў паўстаюць і з мастацкіх кінакарцін вытворчасці студыі «Беларусьфільм». Прыгадаем Канстанціна Заслонава і яго баявых сяброў па падпольнай рабоце з аднайменнага фільма, або юную Марыну Казаніч і Колю Дзеева, бясстрашную камуністку Ганну Чорную з патрыятычнай кінастужкі «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Вобразы іх незабыўныя, справы, вартыя пераймання.

Рамантыкай барацьбы, патрыятычным пафасам хвалявау нас фільм «Дзяўчынка шукае бацьку». Адлюстраваныя там падзеі цікавыя настолькі, што фільм больш пяці гадоў паспяхова крочыць па экранах нашай краіны і за рубяжом. Пра тое, як сустрэлі першы дзень вайны байцы аднаго вайсковага злучэння, даведаліся мы з фільма «Чалавек не здаецца», выпушчанага чатыры гады таму назад.

У мінулым годзе кінагледачы былі сведкамі, як мужна змагаліся з ворагам артылерысты—героі аповесці В. Быкава «Трэцяя ракета». І хоць не ўсё дастаткова пераканаўча паказалася нам у фільме, але ў патрыятызме і самаадданасці яго герояў і аўтара мы не сумняваліся. На экране была суровая праўда вайны, франтавыя будні.

Толькі што закончаны здымкі двух новых беларускіх кінафільмаў пра герояў-патрыётаў. Гэта—«Праз могілкі» па аднайменнай аповесці П. Ніліна (рэжысёр-пастаноўшчык В. Гураў) і «Лісты да жывых» («Песня пра Вераніку», сцэнарый А. Кучара, пастаноўка В. Вінаградава). Апошні кінатвор прысвячаецца памяці слаўнай дачкі беларускага народа, Героя Савецкага Саюза Веры Захараўны Харужай.

У творчых планах кінастудыі — новыя пастаноўкі аб гераізме і патрыятызме савецкіх людзей.

Е. БОНДАРАВА,
член Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР.

## Космонавту №

*Привычкой строгою разбужен,*
*Что всех будильников точней,*
*Ты по замёрзшим за ночь лужам*
*И мимо голых тополей*
*Идёшь, и рад шальному марту,*
*И на мгновение забыл,*
*Что кто-то там на звёздных картах*
*Тебе дорогу проложил,*
*Дорогу трудных испытаний*
*За неизвестную черту;*
*Забыл, что этим утром ранним*
*Деталь к детали, болт к болту,*
*Горды и, зависть не скрывая*
*К твоей космической судьбе,*
*В тени ангаров собирают*
*«Квартиру» новую тебе,*
*Что в тишине лабораторий*
*Уже давно профессора*
*В итоге диспутов и споров*
*Пришли к решению: «Пора!»*
*Забыл, вконец ошеломлённый*
*Врасплох нахлынувшей весной,*
*Что в толчее редакционной*
*Уже давно вскипает бой:*
*Кому готовить объективы,*
*Кому доверить интервью*
*И кто окажется счастливым*
*И биографию твою*
*Обыкновенную напишет,*
*Расскажет будущим векам...*
*А ты идёшь. Роняют крыши*
*Сосульки звонкие к ногам.*

Степан БОРОДОВСКИЙ,
студент 1 курса отд. журналистики.

# ЭТАПЫ „ВЯЛІКАГА ШЛЯХУ“

**(Са справаздачы аб вытворчай практыцы студэнта 3-га курса аддзялення журналістыкі Віктара Асаулава).**

Калі я пераступіў парог рэдакцыі адэскай абласной газеты «Знамя коммунизма», бурных апладысментаў, воклічаў «ура» і залпаў салюта не было чуваць. Абставіны былі больш чым скромнымі. Я нават сказаў бы, палохаючымі. «Як сустрэнуць?»

Гутарка з намеснікам рэдактара працягвалася, здавалася, цэлую вечнасць. Калі ж Уладзімір Георгіевіч Нікалаеў сказаў, што заўтра я магу пачынаць, я адчуў, што скінуў з плеч груз, які не падняў бы і мой аднакурснік, штангіст Эдзік Ясны.

Кіруючыся парадай нашага выкладчыка Сямёна Осіпавіча Цаленчука, які гаварыў у свой час, што аддзел пісьмаў у рэдакцыі самы цікавы, я рашыў пачаць практыку менавіта з гэтага аддзела.

Калі я нясмела ўвайшоў у аддзел, яго загадчык Канстанцін Аляксандравіч Осіпаў паглядзеў на мяне здзіўлена. Пазней я даведаўся пра прычыну гэтага здзіўлення. Аказваецца, спрадвеку практыканты хаваліся «ў падполле» пры адной думцы, што прыдзецца працаваць з пісьмамі. І калі хто-небудзь з членаў рэдкалегіі спрабаваў угаварыць практыканта пайсці ў аддзел пісьмаў, то апошні рознымі прыёмамі, хітрымі фінтамі і галавакружнымі рыўкамі імкнуўся па краю пайсці на «свабодны».

Сапраўды, аддзел пісьмаў у рэдакцыі найбольш цікавы і адзін з самых цяжкіх. Сюды прыходзяць таксама людзі са скаргамі, прапановамі, просяць парады.

— Я кахаю хлопца, — сказала адна дзяўчына, — а ён не звяртае на мяне ніякай увагі. Што мне рабіць?

Вось дык задачка! Што я магу адказаць беднай дзяўчыне? Усё ж агульнымі намаганнямі спрабуем заспакоіць яе. Не ведаю, наколькі дзейснымі былі нашы довады, але дзяўчыну гэтую я больш не сустракаў.

Паўтара месяца я працаваў у аддзеле пісьмаў і масавай работы. За гэты час падрыхтаваў да друку некалькі дзесяткаў пісьмаў. А потым перайшоў у аддзел інфармацыі. Калі я прайшоў «інфармацыйны курс навук», мяне напярэдадні летняга спартыўнага сезона ўзвялі ў ранг загадчыка аддзела спорту. На недахоп «аўтуры» скардзіцца не прыходзілася.

Сваю смагу да футболу здаволіў менавіта тут. Не было ніводнага матча, які я не адлюстраваў бы на старонках газеты. Праўда, пасля кожнай справаздачы мне прыходзілася ці трапляць пад гарачы «балельшчыцкі душ», ці выслухоўваць лёдавыя «віншаванні» па тэлефоне. Мая трагедыя была ў тым, што я пастаянна знаходзіўся між двух агней — прыхільнікаў «Чарнаморца» і СКА. Мая любоў да абедзвюх каманд сонечнай Адэсы дасягнула зеніту, калі мне ўдалося атрымаць пастаянны прапуск на стадыён, у ложу прэсы.

З камандыровак найбольш плённай была паездка ў Ізмаіл. Я перш за ўсё наведаў музей А. В. Суворава, агледзеў славутасці горада рускай славы. Напісаў нарыс пра кранаўшчыкоў Ізмаільскага порту. На рэдакцыйнай «лятучцы» нарыс адзначылі і вывесілі на дошку лепшых матэрыялаў.

З Кадымі прывёз матэрыял пра сям'ю Бараноўскіх. Назваў яго «Спытайце вы ў маці...».

Пісаў я і на іншыя аддзелы: эканамічны, ідэалагічны, савецкага будаўніцтва. Надрукаваў больш як сорак матэрыялаў. Выкарыстоўваў у іх усе лепшыя, на мой погляд, якасці мовы, але лічэбнікі ў мяне сустракаюцца значна радзей, чым у майго аднакурсніка Альбіна Макарэвіча...

Калі я пакідаў сцены стаўшай роднай мне рэдакцыі, урачыстых праводзінаў не было. Былі моцныя сяброўскія поціскі рук, пажаданні выдатнай здачы экзаменацыйнай сесіі і вялікіх поспехаў на журналісцкім шляху. Дзякуй вам, сябры!

В. а. рэдактара В. ДУБОВІК.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02973. Тыр. 2000. Зак. 2507